

# Аляксандр НАЎРОЦКІ
# (1940-2022)

1 мая 2022 года пайшоў з жыцця вядомы польскі паэт, выдавец, перакладчык Аляксандр Наўроцкі, аўтар многіх кніг, лаўрэат шматлікіх літаратурных узнагарод. Аляксандра Наўроцкага можна назваць міжнародным грамадскім дзеячам, сапраўдным энтузіястам, дзякуючы якім мастацтва збліжае цэлыя краіны і народы. Гродзеншчына шмат гадоў традыцыйна развівае культурныя сувязі з суседзямі. Менавіта намаганнямі Аляксандра Наўроцкага і яго жонкі Барбары Юркоўскай (памерла ў 2020) былі дасягнуты значныя практычныя вынікі: у Варшаве была выдадзеная польска-беларуская анталогія паэзіі «Mosty» («Масты: Гродна – Варшава; Варшава – Гродна»). У межах праекта сучасныя літаратары Польшчы і Беларусі здолелі пасябраваць, наладзіць каштоўны ўзаемаабмен. Творы многіх сучасных паэтаў Гродзеншчыны былі апублікаваныя ў перакладзе на польскую мову, а вялікая група польскіх калег прадставіла сваю паэзію беларускаму чытачу ў перакладзе на беларускую мову; творы гродзенскіх аўтараў з'яўляюцца на старонках літаратурнага часопіса «Poezja Dzisiaj» («Паэзія сёння»); прадстаўнікі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі атрымалі магчымасць удзельнічаць у Міжнародным фестывалі славянскай паэзіі і Сусветных Днях паэзіі пад эгідай ЮНЕСКА, арганізатарам якіх быў Пан Аляксандр. Усё жыццё гэтага таленавітага, цікавага чалавека па сваёй сутнасці і было мостам, па якім творчыя людзі з розных краін маглі хадзіць адзін да аднаго ў госці і нясці з сабой дабрыню, сяброўства і натхненне. Выказваем шчырую ўдзячнасць за гэтыя чароўныя масты – што Аляксандр Наўроцкі збудаваў для ўсіх нас. Мы глыбока смуткуем з прычыны смерці нашага польскага калегі і сябра, паэта, выдаўца, перакладчыка Аляксандра Наўроцкага і выказваем шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Гродна - Варшава*